сэрца. Апроч таго, кожны піонэр скажа, што дрэнны той вайсковы, які ня будзе мець пад рукамі сваёй зброі. Бадай, ці патрэбна каму гэткая «дбайнасьць»?

Так і ў «Творчай ночы», апроч зданяў гэрояў грамадзянскай вайны, прыходзяць да яго і... дзяўчаты. Арыгінальна пачаты верш зьбіваецца на шаблённую «філёзофію» аб каханьні. Мы амаль што не кранаді разьдзелу «На сваім парозе». Вось у ім таксама можна знайсьці багата поэтычных і ідэолёгічных прарываў. Калі раней ён адчувае сябе змагаром і ўдзельнікам будаўніцтва, гаспадаром сваіх дзён, дык тутака—у гэтым разьдзеле—абставіны і раней вызначаныя догматы крыху зьменьваюцца:

> Няхай асудзяць—перасудзяць
> Бяздомны мой брадзячы лёс,

—кажа поэта.

Калі ў адным месцы ён зусім слушна запэўняе, што яго поступ—поступ працоўных, што ён, з гэтай прычыны, ніколі ня спыніцца ў дарозе, дык на старонцы 85 ён робіць двусэнсавую заўвагу:

> Мы заўжды йдзем да сьветлай
> мэты.
> Пакуль у дарозе ня пристанем.
> Ёсьць неабдымнасьць ў сьвеце
> гэтым,
> Ёсьць недасяжнасьць у парываньнях.

Выходзіць так, што на «сваім парозе» поэта спатыкнуўся.

Нельга абмінуць і верш «Быццам хтось жартуе»... (стар. 49). Трэба тольні пашкадаваць, што ў «поэтычных запісках» Хведаровіча знайшлі месца такія вершы, дзе неакрэсьленае ўяў прэваляе над розумам поэты. Нічога няма дзіўнага, што:

> Сам я вінаваты, нечага злаваць
> І баліць з бяссоньня
> моцна галава.

Сам поэта вінен у тым, што такія вершы зьмяшчаюцца побач з творамі аб размаху социялістычнага будаўніцтва. Вось чаму, разумеючы памылкі, трэба іх выпраўляць.

Канчаючы абеглы разгляд новай кніжкі Хведаровіча, мы павінны параіць яму асабліва ўважліва аднесьціся да мастацкага боку сваёй творчасьці. На некаторыя хібы мы паказалі. Мікола Хведаровіч павінен памятаць, што толькі клясавая выразнасьць і—з другога боку—найвышэйшая мастацкасьць могуць стварыць у спалучанасьці сапраўды патрэбны нашаму грамадзтву, якое будуе социялізм, твор для пасьпяховага будаўніцтва гэтага социялізму.

Барыс Мікуліч.

Менск. 15/XII—30 г.

---

# Пра „Вяршыні жаданьняў" Вал. Маракова

Вышаў з друку трэці зборнік поэзіі «Вяршыні жаданьняў» поэты Валерыя Маракова. Першым зборнікам яго творчасьці быў зборнічак вершаў «Пялёсткі» (1926 г.), выхад якога нашаю крытыкаю быў узяты ў штыхі за поўную адсутнасьць грамадзкіх мотываў, за адрыў ад грамадзкага жыцьця нашае эпохі і, як вынік гэтага адрыву, насычанасьць мотывамі пэсымістычнага, упадніцкага сьветаўспрыняцьця, беспрасьветнага ныцьця.

Мала чаго новага ў прасьвятленьне ад туманнага засьціну гэтых мотываў унёс і другі, які вышаў неўзабаве пасьля «Пялёстак», зборнік «На залатым пакосе» (1927 г.), але які ўсё-ж такі да некаторай ступені сьведчыў аб станоўчых момантах у творчым поступе поэты (прысутнасьць элемэнтаў грамадзка-палітычных мотываў). І далей разьвіцьцё творчасьці поэты пайшло па шляху поўным супярэчліва-процілеглых тэндэнцый. То поэта спрабуе вызваліцца з-пад палону таго зачараванага кола, якое моцна трымае яго ў сваіх абоймах і афарбоўвае пялёсткі маладое юнацка-ружовае радасьці ва ўпадніцка-пэсымістычныя колеры, разбаўляе зусім станоўчыя парываньні поэты-юнака да радасьці новага жыцьця атрутай індывідуалістычна-суб'ектывіцкіх настрояў, мяшчанска-абывацельскага быцьця, што знайшло найбольш поўнакроўнае мастацкае ўцелясьненьне ў глыбока-пэсымістычнай «Маёй поэме» («Полымя №№ 1, 3, 4—1929 г.). У гэтай поэме хістаньні поэты паміж тэндэнцыямі заволадваньня поэтаю магутным размахам будаўніцтва новага і падупаданьня пад уплыў і ўладу тэндэнцый па сваёй накіраванасьці супроцьлеглых першым—мотывам мяшчанска-абывацельскім, губляньне жыцьцёвых сьцежак і пуцін, адрыў ад здаровага творчага жыцьця і ўцяканьне ў нетры богемы, упадніцтва, разлаганьне і г. д. дасягнулі таго пункту разьвіцьця, калі пытаньне, якое павінна стаяць перад кожным папутнікам пролетарыяту, папутнікам пролетарскае рэволюцыі—ці разам з пролетарыятам, ці супроць яго (сярэдзіны не павінна быць)—у сваім вырашэньні давала больш стымулаў на карысьць ня першага адказу, а другога («супроць»).

Але поэта паступова пачынае ўсьвядомліваць социяльную «обреченность»

на выміраньне тае богэмы, упадніцтва, чым паланіла яго творчасьць дробнабуржуазнае быцьцё:

«...Тут туман,
Тут пыл сталецьцяў душыць,
Тут сум забытых,
Дальніх
І чужых...
Тут
Па-асьлінаму, падняўшы горда вушы,
Гавораць так,
Што ім абрыдла жыць!
Я знаю іх... Я ім калісьці верыў...
Я іх балота славіць пачынаў,
Пакуль мне
Ў лепшы сьвет
Не адчынілі дзьверы,
Пакуль іх дум,
Іх пачуцьця ня знаў...»
(«Вяршыні жаданьняў» ст. 5-6).

(Дарэчы поэта кажа аб тым, што падуплыў быў несьвядомы, не азмысьлены—«іх дум, іх пачуцьця ня знаў»,—што становіць сабою пры ўсьведамленьні больш магчымасьці і даных для канчатковага адыходу і скіданьня з сябе бярэмя гэтага падупаданьня).

Але поэта ўбачыў новае жыцьцё без усьведамленьня ягонага месца («дзесьці»), канечных мэт і ідэй яго. Яно яго захапляе, але не азмысьліваецца ў яго конкрэтнасьці, рэчавасьці:

«Ёсьць лепшы сьвет
Напружнай творчай працы,
Ёсьць сонца, песьні, ёсьць вясна...
Ёсьць шчасьце йсьці
І верыць,
І змагацца,
І вольнай думкай ў творчасьці
Лунаць.
Там д з е с ь ц і [1]), там у ячэйках
І ў школах
Жывуць д р у г і м  н а п р у ж а н ы м жыцьцём.
Ня хіляць галаў
Нізка долу
І не згараюць
Ў мёртвых пачуцьцёх».
(«В. Ж.» ст. 5).

Якое гэта жыцьцё і з якімі яно мэтамі—гэткага пакуль няма ўсьведамленьня. Даецца толькі тое, што гэты новы сьвет—«лепшы» і адзнака адменнасьці гэтага новага жыцьця («другое») ад свайго ранейшага, адзнака яго «напружанасьці», ды яшчэ тое, што ў ім «ня хіляць галаў нізка долу і не згараюць у мёртвых пачуцьцёх». Тое-ж, што «ёсьць шчасьце йсьці і верыць, і змагацца, і вольнай думкай ў творчасьці л у н а ц ь (!!?), яшчэ зусім не вызначае канечнае мэты і ідэі гэтага жыцьця ў дачыненьні да яго, як да об'екту, існуючага па-за суб'ектыўнымі жаданьнямі поэты. У адносінах-жа да гэтага жыцьця поэты (тыпа-вобраз якога компануе асоцыяцыя ўсіх мотываў творчасьці), як суб'екту ў дачыненьні да гэтага жыцьця, можна сказаць, што ён якраз у гэтым жыцьці і бачыць мэтаю (ці, кажучы ягонай тэрмінолёгіяй—«шчасьцем»), а ня сродкам, гэта—«йсьці і верыць, і змагацца»—і наіўнае—«вольнай думкай ў творчасьці л у н а ц ь».

І тое, што для сьвядомага будаўніка соцыялістычнага сёньня зьяўляецца толькі с р о д к а м для ажыцьцяўленьня ідэі пабудовы соцыялістычнага ладу,—тут набывае м э т у, і д э ю:

«Ў напружнай творчай працы
Знаходжу ўсё:
І радасьць,
І любоў.
Я знаю шчасьце—верыць і змагацца,
Ісьці, гарэць, ўпівацца барацьбой...»
(«В. Ж.» ст. 6).

Да некаторай ступені правільную характарыстыку свае творчасьці, дапамагаючай разуменьню соцыяльнай законамернасьці, дае сам поэта, кажучы, што ён:

«З балота бруду і мяшчанства
Ўсё-ж бачыў полымя зарніц.
Я гадаваў у сабе
Паўстанца
І новым дням схіляўся ніц»...
(«В. Ж.» ст. 75).

Поступ новага жыцьця прасьвятляе перад поэтам жыцьцёвыя далягляды, расчыняе шырокае поле дзейнасьці тэй часткі грамадзтва, для якое ўваход на гэта поле дзейнасьці быў надзвычайна звужаным альбо зусім закрытым, і погляды якое поэта выказвае:

«Ўстае вясна
Ў разгары сьветлых гімнаў,
І чэзьне дым з жыцьцёвых берагоў...»
«Жыцьцё па-новаму красуе маладых...
Вакол так многа веры, парываньняў,
Так многа песьняў сонечнай вясны».
(«В. Ж.» ст. 21).

І пад напорам уздымнага пачуцьця поэта зварочваецца да комсамолу:

«О, я таксама з новаю культурай
Іду аднэю з вамі паласой,
Каб несьці сьцяг змаганьня,
Перамогі,
Гарэць імкненьнем юных і жывых»...
(«В. Ж.» ст. 21-22).

Але адсутнасьць моцных соцыяльных карэньняў у творчасьці Валерыя Маракова дае надзвычайна адчуваць сябе. Поэта і тут яшчэ соцыяльна зусім не аформіўся, канчаткова ня вызначыўся.

[1]) Тут і далей падкрэсьлена мною—У. С.

Тэндэнцыі зруху ў бок новага ў В. Маракова носяць характар неазмысьлены, стыхійны, характар выбуху пачуцьцяў, ня маючы і каліва адзнакі пранікненьня гэтымі зрухамі ўсяго яго сьветапогляду ў конкрэтным дачыненьні да гэтага новага. Поўнае панаваньне над усім псыхо-ідэолёгічным складам стыхійнага, выбухі якога выліваюцца ў гэткія, зусім неакрэсьленыя, неконкрэтныя агульныя слова-вобразы, як «вясна», «песьні», «сонца», «шчасьце», «уздым», «мяцежныя пачуцьці», «радасьць», «сьмех», «вясельле», «навалы», «разгар», «перамога», «барацьба», «змаганьне», «верыць», «жыць», «бунтоўныя», «бурныя», «юныя», «сьветлыя», «харошыя», «залатыя», «буйныя», «ласкавыя», «жывыя», «душа», «прасторы», «стыхія», «раньне», «новыя», «любыя» і г. д. Конкрэтнага, рэчавага, а ня слоўнага азмысьленьня новага жыцьця няма, няма і сьвядомага, глыбокага падыходу да яго. Вобразны, мастацкі н а к а з новага, а не расказ аб ім, у Маракова зьмяняе схэматычны, гола-фразёрскі, павярхоўны падыход да нашае творчае сучаснасьці:

«Новае сёньня красуе
Новыя песьні
І час...
Гляньце, навакол будуюць
Ўраз за колгасам
Колгас.
Нетры сталёвых багацьцяў
Мы пераплавім
Ў плугі—
З цемрай і брудам
Змагацца,
Біць па магілах тугі...
Кожная кропля
Жалеза
Пойдзе для гарту зямлі.
Што залатыя нам
Крэзы,—
Ў нас залатыя палі!
Ўзрыем мы горы
І нетры,
Пусьцім экспрэсы ў разьбег».
(«В. Ж.» ст. 39-40).

Сказаць словы—«новае сёньня красуе», «новыя песьні і час», што «будуюць колгас за колгасам», і «нетры сталёвых багацьцяў мы пераплавім ў плугі», і што трэба змагацца, «змагацца з цемрай» і г. д., ня ўклаўшы ў гэтыя паняцьці конкрэтны зьмест,—значыць, што мастак нічога не сказаў, бо «поэт мыслит образами; он не доказывает истины, а п о к а з ы в а е т ее» (Бялінскі). (Падкрэсьлена мною—У. С.) і «там нет и следа художественного творчества, где эта идея так и является в своем «отвлеченном виде»... (Пляханаў). У В, Маракова не хапае творчых сіл для мастацкага вобразнага паказу нашае творчае рачаіснасьці ва ўсёй яе глыбіні, супярэчнасьцях і тэндэнцыях разьвіцьця.

Гэтыя катэгоры: ў творчасьці В. Маракова замяняе бунтоўная стыхійнасьць, пачуцьцёвая інтуіцыя, якія, не знаходзячыся пад сталым контролем сьвядомасьці і падначальваючыся якім, далей сьлепаты да жыцьцёвых працэсаў не вядуць. Ня маючы моцнага соцыяльнага пункту апоры, ён часам сьлепа падпадае пад уплыў розных тэндэнцый у процэсах руху об'ектыўнае рачаіснасьці.

Часам дае аб сабе знаць пэўны псыхічны разлад поэты з рачаіснасьцю, пэўная раздвоенасьць, налёт пэсымізму, апоэтызаваньне суму:

«Цені бягуць другія,
Сьніцца сэрцу другі экран...
Дзе-ж вы, мае дарагія,
Дзе ваш раскінуўся стан?
Песьні сьпяваюць навокал.
Вецер зьвініць і зьвініць.
Мабыць, яшчэ далёка,
Мабыць аб іх мне ня сьніць.
У казках і ў песьнях і ў думах,
У шуме і звоне дарог
Сэрца с а г р э т а е с у м а м,
Роднаму краю зьбярог»...
(«В. Ж.» ст. 34).

Гэты душэўны разлад і соцыяльныя ўплывы падкрэсьліваюць тое, што ўлюбёным вобразам поэты зьяўляецца вобраз жанчыны з «сэрцам пры стаўшым», «рассыпанымі юнымі днямі», ня вобраз жанчыны-работніцы і сялянкі—актыўных барацьбітоў за соцыялістычнае заўтра, што ідуць у ногу з мужчынамі, рушаць усё старое і будуюць новае, а вобраз жанчыны-мяшчанкі, сумуючай па ўтрачанай юнацкасьці ў абстрагаваных ад усяго грамадзкага жыцьця прыгодах каханьня, якая жыве толькі мінулым, тым, што яна «ўсё-ж калісьці кахала і захапляўся ёю не адзін («Ты гаворыш»...—«В. Ж.» ст. 12 і інш.). З боку адсутнасьці моцных соцыяльных каранёў, соцыяльнай невызначальнасьці і разладу поэты з сёньняшняю рачаіснасьцю цікава прасачыць тое, што як з вёскаю, гэтак, галоўным чынам, з горадам поэта ня мае контакту, органічнага адзінства, цэльнасьці. Падуладнасьць стыхійнасьці кідае яго ад аднаго да другога і нідзе не становіць яго ў сталае дачыненьне да пэўнага месца (гораду ці вёскі). Прыродзе поэта адводзіць галоўнае месца ў псыхолёгічным контэксьце свае творчасьці.

Амаль усе мотывы гэтае творчасьці поэта выносіць на лона прыроды і, яскрава падкрэсьліваючы, становіць яе фонам, на якім дае пэўнае выражэньне сваім настроям. На фон апоэтызаванай і ідэалізаванай поэтаю прыроды ім выносяцца ўсе соцыяльныя, грамадзкія і чыста лірычныя асобныя мотывы:

«Руйнуй мінулых дзён галгофу,
Дзе сэрца краю Мураўёў
На жах,

На крыўду ўсёй Эўропы
Мячом Расіі пракалоў.
Пракляцьце, кат, табе і злодзей.
Цябе пракляў
Мой родны край.
Такім, як ты, сказаў ён:
— Годзе,
Даволі сэрца надрываць!..
Так я стаяў,
Так марыў ў нівах
Маіх прастораў залатых.
І ў глыбіні душы шчасьлівай
Зьнікаў туман, праходзіў дым»...
(«В. Ж.» ст. 47-48).

Тут прырода поэтаю гэтак ідэалізавана, што яна зьяўляецца і сродкам «исцеления» душы поэты ад туману і дыму жыцьцёвага шляху («і ў глыбіні душы шчасьлівай зьнікаў туман, праходзіў дым»). Прырода «мэту абуджае быць вечна чыстым, маладым!» («В. Ж.» ст. 63). Прырода зьяўляецца об'ектам лепшых імкненьняў поэты:

«І я пайшоў—палёў бяскрайніх,
Вясны бяскрайняй
Ўзяць агонь»...
(«В. Ж.» ст. 64).

Лепшымі мастацкімі мясьцінамі ў творчасьці В. Маракова зьяўляюцца малюнкі прыроды:

«Ліпнёвы вечар дагараў
Ў абдымках ласкавых і кволых.
І тонкагубы вецер граў
Над дальлю ніў,
Палёў і сёлаў
Такою дзіўнаю гаворкай,
Такою ласкавай красой,
Як гэта даль,
Як гэта зорка,
Над гэтай буйнай паласой...
Хтось кінуў ружы на закаце
Жывой і сонечнай рукой,
І, нібы казачная маці,
Ноч навявала ім спакой.
Ў адзеньне змроку, забыцьця
І сну,
Бяссоньня і трывог
Сюды прыходзіў з нябыцьця,
Хто пакахаць, хто верыць мог»...
(«В. Ж.» ст. 67—68).

Тут прырода зьяўляецца месцам лепшых жыцьцёвых імкненьняў поэты. Лепшыя мастацкія вобразы ў творчасьці В. Маракова належаць вобразам прыроды (праўда, у значнай меры вобразам сантымэнтальным):

«Закат крывавымі і тонкімі рукамі
Матаў істужку сонечнай зары».
(«В. Ж.» ст. 49)

Гэроі поэмы «Таварыш Нюрын»—муляры—

«Гукалі зорных вечароў,
Дзе стан бярозкі белацелай (!)
Падпаясаны быў зарой».
(«В. Ж.» ст. 69).

Горад-жа выклікае разлад поэты з ім. «раніць» яго:

«І параніў я ногі
Аб крэмні,
Аб граніт і цамэнт маставых».
(«В. Ж.» ст. 74).

У сучасным савецкім горадзе поэта адчувае сябе непрыстасаваным, як-бы не на сваім месцы. «Кветкі дарагія» яго і там вабяць сваёй чароўнасьцю, і поэта «адлятае душой у дым»:

Гудзеў трывожна шумны горад.
І гул узрастаў, як акіян.
Я да яго ішоў прастораў
Бяз болю,
Крыўды і бяз ран.
Я успрымаў яго стыхію
Стыхіяй юных сіл сваіх...
...І сьніў аб кветках дарагіх я
На пыльных плітах гарадзкіх.
Я кідаў працу, кідаў дружбу...
Я адлятаў душой у дым».
(«В. Ж.» ст. 69-70).

І толькі на лоне прастораў, абстрагаваным часта ад усяго грамадзка-чыннага прыроды, поэта знаходзіць спакой:

«Тут так хораша, промняў так многа...
Срэбны месяц прылёг на кусты.
Я іду сваёй роднай дарогай,
Зноў вясёлы і зноў малады.
Сёньня ўсё—
Гэта хвойнік і Сьвіслач,
Да сябе заклікаюць пажыць.
Колькі стройных бяроз панавісла
Над вадой і на грудзі мяжы.
Срэбны месяц каханьнем гарыць,
Годзе песень, разгулу, трывогі,
Хоць хвіліну адну так пажыць!»
(«В. Ж.» ст. 33)

Але поэта ня спыняецца на гэтым, далей ён пяе гімны наступленьню новае эпохі, ратуе за магутны поступ сонечнага, новага, праўда, бяз клясавага чоткага вызначэньня суб'екта—носьбіта гэтага новага—пролетарыяту:

«Мы пабудуем сьветлы дзень,
Дзе новы творца
Чалавек
Дарогай простаю ідзе
Без надламаных
І калек.
Мы ўзьнясем сьвятла палац,
Мы ў вокны кінем
Промні сонца,
Каб нашым будучым палаць
І сьніць аб будучай
Старонцы.
Там, пад праменьнямі вясны,
Да сьвету пройдуць
Міліёны,
І аб мінулым успамін
Сатрэцца трактарнай колёнай.

І ў новых
Чыстых гарадох
Быць можа
Успомняць на хвіліну
Аб нашых ранішніх
Шляхох —
Ў прасторы будучай краіны»..
(«В. Ж.» ст. 85)

Праўда, мала яшчэ абстрактна, схэматычна марыць аб будучым, не азмысьліваючы конкрэтнага, поўнакроўнага, рэчавага твару нашай штодзённай, поўнай ценявых і сьветавых бакоў рачаіснасьці. Задачай мастака зьяўляецца паказ супярэчлівых тэндэнцый разьвіцьця гэтага сёньняшняга і паказ гэткі, каб у тэндэнцыях разьвіцьця сёньняшняга ва ўсёй плоці быў бачны дзень заўтрашні, пэрспэктывы будучага. Толькі выходзячы з сёньняшняга, можна правільна паказаць будучае.

Каб дасягнуць гэтага, каб стаць пісьменьнікам рабочае клясы, пролетарскай рэволюцыі, ці хоць саюзьнікам пролетарыяту, Валеры Маракоў, як поэта, адбіваючы ў сваёй творчасьці зрухі прамежных социяльных пластоў пад узьдзеяньнем пролетарскае рэволюцыі, павінен усьвядоміць неабходнасьць карэннага перавыхаваньня сябе шляхам сталай і бязупыннай працы над пераробкай свае социяльнае прыроды, над пераробкай усяго строю свае псыхо-ідэолёгіі ў напрамку адпаведнасьці задачам рабочае клясы ў социялістычным будаўніцтве.

Маракову неабходна ўключыцца ў штодзённую практыку рабочае клясы, крытычна і глыбока пераацэньваючы ранейшыя каштоўнасьці. Неабходна помніць, што бяз гэтае працы лепшыя намеры і імкненьні набліжэньня да пролетарскае літаратуры пісьменьніка з псыхо-ідэолёгіяй прамежных социяльных груп ні да чаго не прывядуць.

А Валеры Маракоў сваёю апошняю творчасьцю паказвае сымптомы набліжэньня да нашае творчае рачаіснасьці і яе адлюстроўваньня, аб чым сьведчаць надрукаваныя ўвясну 1930 г. у газэце «Савецкая Беларусь» урыўкі з новай поэмы «Зямля бунтуе». Праўда, надрукаваныя ўрыўкі поэмы «Зямля бунтуе», ня гледзячы на вельмі дадатную і заслугоўваючую ўвагі спробу адлюстраваньня социялістычнага будаўніцтва і клясавае барацьбы (у даным выпадку, на вёсцы), паказалі і слабасьць поэты, падкрэсьліўшы неабходнасьць пераробкі ягонай псыхолёгіі.

Толькі ў карэннай, органічнай пераробцы свайго нутра, сваёй социяльнае прыроды ў адпаведнасьці з задачамі рабочае клясы ляжаць пуціны да далейшага росту і творчага росквіту поэты.

8/XI-1930 г. У. Л. Сядура.

**В. Сташэўскі. „Гаворыць Асінстан імя Сталіна“.**

**Нарыс. БДзВ Менск. 1930 г. Стар. 80. Тыр. 5000 экз., *цана 50 к.***

У апошні час сярод пролетарскае літаратуры, як жанр, пачаў практыкавацца нарыс. Нарыс зараз заняў шырокае месца як сярод расійскай пролетарскай літаратуры, так і беларускай. І гэта зусім зразумела. Наша жыцьцё так шпарка крочыць уперад, так шпарка расьце социялізм у краіне Саветаў, што мастацкая літаратура яшчэ ня ў змозе сёньня ахапіць увесь размах працоўных-будаўнікоў социялізму і мастацкімі вобразамі прадэмонстраваць яго.

Энтузыязм рабочае клясы штогод выкідае з нетраў зямлі на паверхню земнае кулі волаты-фабрыкі, заводы, электрастанцыі. Штогод дзесяткі магутных заводаў, фабрык, электрастанцый, колгасаў, саўгасаў стальлю ўмацоўваюцца на тэрыторыі пролетарскае дзяржавы.

Аб усім гэтым вялізным дасягненьні масаваму чытачу (рабочаму, працоўнаму селяніну) хочацца ведаць, хочацца адчуць, хочацца ўявіць у сваім выбражэньні хоць малюнак гэтага дасягненьня свайго колектыву.

На гэты сур'ёзны попыт масавага чытача дае часта адказ мастацкі нарыс. Ён, бязумоўна, робіць вялікую справу ў сэнсе азнямленьня працоўных з іх дасягненьнямі ў будаўніцтве социялізму. З нарысу працоўны чытач без асаблівай цяжкасьці можа атрымаць адпаведны малюнак, адпаведную ідэю, якую праз яго праводзіць пісьменьнік.

Рэцэнзуемы нарыс В. Сташэўскага «Гаворыць Асінстан імя Сталіна», у сэнсе здавальненьня масавага чытача, у сэнсе перадачы малюнку рачаіснасьці, у сэнсе самой яркасьці перадачы заслугоўвае асаблівай увагі.

Не патрэбна быць на Асінстане, не патрэбна бачыць у пяць тысяч гэктараў плошчу Асінаўскіх балот, не патрэбна бачыць агромністых корпусоў электрастанцыі, карпусоў рабочых пасёлкаў—усё гэта можна ўявіць сабе, прачытаўшы нарыс «Гаворыць Асінстан імя Сталіна».

Нарыс напісаны па-майстэрску. Аўтар схапіў з свайго об'екту ўсе характэрныя рысы, характэрныя кусочкі, з якіх атрымоўваецца цэлы і выпуклы малюнак.

Аўтар спачатку знаёміць чытача, як «пад бальшавіцкі марш пролетарскія атрады вышлі на будаўніцтва першае Беларускае электрастанцыі». Адчуваецца, як гэтыя «пролетарскія атрады», адданыя савецкай уладзе спэцыялісты з бальшавіцкай энэргіяй бяруць у палон адвечную пустэчу-балота. Адчуваецца шум машын, стук малатоў, звон лапат, нібы відаць узмах тысячы рабочых рук.